**Р.С.Матульскі,** *дацэнт*

# СІСТЭМА КАШТОЎНАСЦЕЙ ЯК МЕТАДАЛАГІЧНАЯ БАЗА ФАРМІРАВАННЯ ПРЫНЦЫПАЎ ДЗЕЙНАСЦІ БІБЛІЯТЭК

У сучаснай навуцы тэрмінам «прынцып» (ад лац. principium – пачатак, аснова) абазначаюць зыходнае палажэнне якой-небудзь тэорыі, вучэння, навукі, светапогляду, палітычнай арганізацыі. Вывучэнне і распрацоўка прынцыпаў дзейнасці з'яўляюцца абавязковым элементам любой навукі. Без дакладнага вызначэння зыходных палажэнняў развіццё тэорыі і адпаведнай ёй сферы практычнай дзейнасці, у тым ліку бібліятэказнаўства і бібліятэчнай, немагчыма. Адсутнасць адназначнай трактоўкі прынцыпаў дзейнасці пазбаўляе бібліятэкі арыенціраў як у сферы фарміравання інфармацыйных рэсурсаў, так і пры арганізацыі абслугоўвання карыстальнікаў.

Прынцыпы дзейнасці бібліятэкі фарміруюцца з улікам яе сутнасці як сацыяльнага інстытута, сутнасць жа заключаецца ў збіранні і распаўсюджванні ў прасторы і часе дакументаў з мэтай задавальнення інфармацыйных патрэб карыстальнікаў. Для выканання гэтай місіі бібліятэцы неабходна кіравацца сістэмай каштоўнасцей.

Філосафамі каштоўнасць разглядаецца як катэгорыя, якая ўказвае на сацыяльнае і культурнае значэнне пэўных з'яў рэчаіснасці. Яны ацэньваюцца ў плане дабра і зла, ісціны і няісціны, прыгожага і пачварнага, справядлівага і несправядлівага і інш. Нягледзячы на тое, што меркаванні аб розных відах каштоўнасцей (дабры, прыгажосці, святасці і інш.) сустракаюцца і ў класікаў антычнай філасофіі, і ў тэолагаў сярэднявечча, і ў мысліцеляў Рэнесансу, і ў філосафаў новага часу, абагульняючага ўяўлення аб каштоўнасцях і адпаведна аб заканамернасцях іх праяўлення ў розных канкрэтных формах не было да сярэдзіны XIX ст. Вывучэннем філасофскіх праблем прыроды каш-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тоўнасцей займаецца аксіялогія (лац. axio – каштоўнасць і logos – слова, вучэнне), якая сфарміравалася як самастойная філасофская навука толькі ў канцы XIX ст.

Сістэма каштоўнасцей фарміравалася на працягу многіх стагоддзяў пад уплывам шэрага палітычных, рэлігійных, этычных, мастацкіх, класавых, нацыянальных і іншых фактараў. Так, тэолагамі сярэднявечча прызнавалася толькі адна каштоўнасць – Бог. У рэлігійнай філасофіі, тэалогіі і ў рэлігійнай свядомасці каштоўнасць – гэта ўяўленне аб свяшчэнным, звышпачуццёвым, боскім. Пры гэтым неабходна адзначыць, што ў кожнай рэлігіі сваё веравызнанне, і адпаведна каштоўнасныя арыентацыі хрысціян, іудзеяў, мусульман зусім не тоесныя. Адзінай тэорыі каштоўнасцей не было і ў XVII–XVIII стст. Толькі ў сярэдзіне XYIII ст. стала ўсведамляцца рацыянальна-сцыентысцкая арыентацыя культуры і пачаліся пошукі альтэрнатыўнага погляду на чалавека, яго духоўны свет, сувязі з іншымі людзьмі і прыродай. Рамантызм супрацьпаставіў рацыяналізму Асветніцтва эмацыянальную актыўнасць духоўнага жыцця чалавека і тым самым завяршыў пераход ад традыцыйнай культуры з яе стабільнымі прынцыпамі, асветленымі аўтарытэтам міфа, да культуры асобасна-крэатыўнай, дынамічнай і інавацыйнай, каштоўнаснае забеспячэнне якой успрымалася не як раз і назаўсёды данае, боскае па сваім паходжанні, а як чалавечнае, што фарміруецца ў культуры, і таму зменлівае і ў гістарычным часе, і ў геаграфічнай прасторы.

Тэорыя каштоўнасцей асабліва актыўна развівалася ў XIX–XX стст. і адлюстроўвала спецыфіку фарміравання індустрыяльнага грамадства і капіталістычнага спосабу вытворчасці. У другой палове XX ст. зноў пачалася пераацэнка сістэмы каштоўнасцей, стала фарміравацца новая гнасеалагічная парадыгма, заснаваная на сінтэзаванні класічнай і некласічнай метадалогіі. Сінергетычны стыль мыслення з'яўляецца сінтэзам пазітыўных элементаў дэтэрмінаванай і верагоднаснай карціны свету. У гэты перыяд на змену індустрыяльнаму грамадству прыйшло постіндустрыяльнае, якое паступова трансфармуецца ў інфарма-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цыйнае. Капіталістычнае грамадства пашырыла сваю сацыяльную базу і стала больш сацыяльна арыентаваным. Крах сацыялістычнага ладу выклікаў неабходнасць пераасэнсавання сістэмы каштоўнасцей шматлікіх дзяржаў. У пачатку XXI ст. на развіццё тэорыі каштоўнасцей значны ўплыў аказала ўзмацненне ісламу. Дзеянні радыкальных экстрэмісцкіх плыней, якія прапаведуюць іслам і выкарыстоўваюць тэрарызм у якасці інструмента дасягнення сваіх мэт, прымусілі ўсё чалавецтва вярнуцца да пераасэнсавання пэўных каштоўнасных арыентацый.

У сучасны момант сфарміравалася шмат плыней, прадстаўнікі якіх па-свойму трактуюць прыроду каштоўнасцей. На думку М.С.Кагана, аб стракатасці і заблытанасці агульнай карціны можна меркаваць па разнастайнасці спроб гісторыкаў філасофіі разабрацца ў ёй і класіфікаваць шматлікасць існуючых канцэпцый. Так, А.Эдэль выдзеліў тры кірункі аксіялагічных даследаванняў (ідэалістычны, натуралістычны і прагматычны); тры тыпы тэорыі каштоўнасцей разглядае і Т.Любімава (тэарэтыка-сацыялагічны, метафізічны, адмоўна-крытычны); А.Месер апісаў чатыры напрамкі ў аксіялогіі (фенаменалагічны, ідэалістычны, ідэалістычна-рэалістычны і рэалістычны); М.Кісель выдзеліў пяць тыпаў каштоўнасцей (натуралістычны псіхалагізм, трансцэндэнталізм, персаналістычны анталагізм, культурна-гістарычны рэлятывізм і сацыялагізм); Л.Сталовіч адзначыў у аксіялогіі XX ст. сем плыней (псіхалагічную і семіятычную, аб'ектыўна-анталагічную і фенаменалагічную, экзістэнцыяналістычную і тэалагічную); В. Вейкмайстар вылучыў яшчэ больш падыходаў да пабудовы тэорыі каштоўнасцей (утылітарысцка-эканамічны, эмацыянальна-інтуітывісцкі, метафізічны, персаналістычны, псіхолага-генетычны, фенаменалагічны, інструменталісцкі, эстэтычны, гуманістычны, рэлятывісцкі, эмпірыка-пазнавальны, лінгвістычны і інш.)

Прызнаючы справядлівасць названых відаў класіфікацыі, М.С.Каган палічыў неабходным вылучыць адну групу, якая заключаецца ў спецыяльных адносінах розных навук да феномена



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

каштоўнасцей (таму яго трактоўка сацыёлагамі, псіхолагамі, культуролагамі, лінгвістамі, семіётыкамі, этолагамі, этыкамі, эстэтыкамі, нарэшце "чыстымі" філосафамі не магла не быць рознай), і другую, якая сведчыць, што аксіялагічныя вучэнні адрозніваюцца па метадалагічна-светапоглядных пазіцыях, якія ляжаць у іх аснове. І калі адрозненні першай групы хутчэй дапаўняюць адну тэорыю іншымі, то адрозненні другой вядуць да канфрантацыі тэорыі каштоўнасцей.

У аксіялогіі неадназначна трактуецца пытанне аб носьбітах каштоўнасцей. Традыцыйна вылучаюць каштоўнасці грамадства, народа, нацыі, класа, партыі, калектыву, індывіда. Амерыканскі вучоны А.Маслоў у 1968 г. вылучыў тры ўзроўні каштоўнасцей: агульначалавечы, пэўных груп людзей і ўзровень каштоўнасцей "спецыфічных індывідаў". Правёўшы сістэмны аналіз аксіясферы, М.С.Каган прыйшоў да высновы, што суб'ектамі каштоўнасных адносін з'яўляюцца канкрэтны чалавек (індывід, асоба), невялікая кантактная група людзей, вялікая некантактная сацыякультурная група людзей, "частковы суб'ект" і ўсё чалавецтва як "сукупны аб'ект".

Паколькі бібліятэка ў якасці сацыяльнага інстытута ў сваёй дзейнасці зыходзіць з інфармацыйных патрэб асобных індывідаў, сацыяльных груп (класа, партыі, рэлігійнай суполкі, калектыву прадпрыемства, арганізацыі, установы і г.д.), дзяржавы і чалавецтва ў цэлым, то ў якасці зыходных для яе дзейнасці неабходна разглядаць наступныя групы (узроўні) каштоўнасцей: агульначалавечыя, нацыянальныя, асобных сацыяльных груп і індывіда. Названыя ўзроўні каштоўнасцей з'яўляюцца неад'емным атрыбутам знешняга асяроддзя, у якім функцыянуюць бібліятэкі і аказваюць непасрэднае ўздзеянне на функцыянаванне ўсіх інстытутаў грамадства. Для ажыццяўлення сваёй дзейнасці бібліятэка павінна адпавядаць патрабаванням, якія вылучаюцца знешнім асяроддзем. У процілеглым выпадку яна будзе адарвана ад асяроддзя і ліквідавана. Таму, зыходзячы з іерархіі асноўных груп каштоўнасцей і неабходнасці бібліятэк у сваёй дзейнасці адпавя-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

даць ім, можна сфармуляваць наступныя прынцыпы дзейнасці бібліятэк:

– адпаведнасці агульначалавечым каштоўнасцям;

– адпаведнасці нацыянальным каштоўнасцям;

– адпаведнасці каштоўнасцям асобных сацыяльных груп;

– адпаведнасці каштоўнасцям індывіда.

Рэалізацыя бібліятэкай названых прынцыпаў дзейнасці дазваляе прадастаўляць карыстальнікам інфармацыю аб змесце каштоўнасцей кожнага ўзроўню, ствараць умовы для іх вывучэння, далейшага развіцця і выкарыстання.

**Ю.М.Міцкевіч,** *аспірантка*

## ПРАФЕСІЙНАЯ КУЛЬТУРА І МАЙСТЭРСТВА МЕНЕДЖЭРА ЯК КРЫТЭРЫІ АЦЭНКІ РЭКЛАМНАГА ПРАЦЭСУ

Сёння асаблівую актуальнасць набывае прафесіяналізм менеджэра па рэкламе. Рэклама – гэта не толькі з'ява мастацтва, але і бізнес.

Фарміраванне прафесійнай культуры і майстэрства менеджэра пачынаецца задоўга да яго практычнай дзейнасці. Менеджэр па рэкламе павінен валодаць не толькі ўстойлівым светапоглядам, сацыяльнымі і маральнымі перакананнямі, але і высокім узроўнем камунікатыўнай кампетэнтнасці, і ўнутранай раўнавагай, прычым яго прафесійная культура не можа разглядацца па-за кантэкстам той культуры, у якой ён вырас і жыве.

У структуры прафесійнай культуры менеджэра вызначаюць два асноўныя кампаненты: тэарэтычны і практычны. Калі гаворка ідзе пра тэарэтычны кампанент, звычайна маюць на ўвазе асобасны, г.зн. псіхафізічны, інтэлектуальны, творчы патэнцыял менеджэра па рэкламе. Цікавасць да прафесіі цесна звязана з



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ